Асоба

Архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан:

# «СУЧАСНАМУ ЧАЛАВЕКУ ТРЭБА ТРЫМАЦЦА ЗА ВЕРУ І ДОБРУЮ СЯМ'Ю»

**Першае, чым здзівіў мяне архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан, — сваёй надзвычай прыгожай, сакавітай беларускай мовай. Аказалася, уладыка ведае і любіць класічную беларускую літаратуру, падчас гутаркі не раз прыводзіў вялікую колькасць вершаваных радкоў, не ўтойваў сваёй сімпатыі да творчасці Якуба Коласа. Высветлілася, што архіепіскап — даўні чытач нашай газеты. Да чытання «Звязды» прызвычаіўся ў школьныя гады, газету выпісвалі бацькі. Нават у арміі, у далёкай Туркменіі, атрымліваў беларускую газету, якую выпісала для яго сваячка. А сваіх настаўніц беларускай мовы, Таццяну Васільеўну Сакалову і Марыю Арцёмаўну Бурак, уладыка Стэфан і цяпер згадвае самымі лепшымі словамі.**



За адведзены для гутаркі час мы паспелі абмеркаваць асаблівасці палескага краю і палескай ментальнасці, а таксама некаторыя праблемы сучаснага грамадства. Асабліва непакояць архіепіскапа хібы ў сямейным выхаванні падрастаючага пакалення, недастаткова адказнае стаўленне да стварэння маладымі ўласнай сям'і, памяншэнне духоўнасці грамадства ў цэлым.

***— Шаноўны ўладыка, раскажыце, хаця б коратка, пра свой шлях да веры, да духоўнага служэння.***

— Родам я з Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. У маім дзяцінстве гэта быў адзін з самых бязбожных раёнаў Беларусі. На той час у ім не засталося ніводнай царквы. У адным нашым Смілавіцкім прыходзе было раней тры храмы, а ў 30-я гады іх зруйнавалі і знішчылі. Рабілі нядобрую справу не якія-небудзь прышэльцы, а свае ж вяскоўцы. Потым, як правіла, мы чулі пра іх незайздросны лёс. Вечарамі збіраліся аднавяскоўцы, успаміналі, як раней маліліся ў храме, адзначалі святы. У многіх традыцыі падтрымліваліся ў сем'ях, людзі захоўвалі абразы, у нядзелю не працавалі, вялікія рэлігійныя святы адзначалі па хатах. У царкву я ездзіў у Мінск ужо ў школьныя гады.

***— Бацькі накіроўвалі да Бога?***

— Зусім не. Бацькі прывівалі інтарэс да вучобы. А да Бога я прыйшоў сам. Пасля службы ў сталічным храме часта заходзіў у вялікую кніжную краму. Там на той час было шмат бязбожнай літаратуры — цэлыя паліцы. Але я прастойваў ля іх гадзіны паўтары-дзве і ўсё ж знаходзіў нешта патрэбнае для сябе. Некаторыя кнігі мне здорава памаглі, там была інфармацыя, што сеяла сумненні і будзіла цікавасць. Хацелася самому знайсці адказы на многія пытанні... Пасля сямігодкі паступіў у сельскагаспадарчы тэхнікум, вывучыўся на агранома і атрымаў накіраванне ў гаспадарку Пастаўскага раёна. У вёсцы жылі два старыя дзядкі, якія нейкім чынам мяне прыкмецілі, давалі чытаць рэлігійныя кніжкі. Вядома, употай. Потым тры гады адслужыў у войску, у Туркменіі. Вярнуўся дадому, зноў працаваў аграномам. А ў 1972 годзе паступіў у Маскоўскую семінарыю. Пасля семінарыі была акадэмія. Потым працаваў у Жыровічах, і вось ужо 24-ы год — у Пінскай епархіі.

***— Чым адрозніваецца епархія два дзясяцігоддзі таму і цяпер?***

— Калі я прыйшоў сюды на служэнне, у епархіі — гэта значыць, у васьмі раёнах вобласці — было 80 храмаў, цяпер іх амаль 180. Пабудавалі новыя альбо адрадзілі каля сотні цэркваў. Сёння ўжо не толькі ў гарадах, але і ў некаторых вялікіх сельскіх населеных пунктах па дзве царквы (у такіх, як Альшаны, Давыд-Гарадок). Як часта кажуць, прыйшоў час збіраць камяні, тыя, што параскідалі падчас бязбожжа, калі руйнавалі цэрквы. Цяпер вось збіраем. Праўда, на Палессі не столькі разбурылі і закрылі, як у цэнтральнай і ўсходняй Беларусі. Але і тут многае давялося збіраць, аднаўляць.

Радуе, што многія людзі пацягнуліся да веры, што адпраўляюць дзяцей у нядзельныя школы. А дзеці-слухачы нашых школ, бывае, потым бацькоў агітуюць прыйсці ў храм і запоўніць прабелы ў рэлігійных ведах. Самыя першыя наведнікі нядзельнай школы ўжо самі сталі бацькамі і прыводзяць сюды дзяцей. Усяго па епархіі лік такіх школ набліжаецца да ста. Прыемна, што некаторыя дарослыя адчулі патрэбу ў духоўнай асвеце. Пры нядзельнай школе жаночага манастыра ў нас утварылася група дарослых слухачоў, якія ходзяць на заняткі. Дарослыя групы цяпер ёсць пры храмах амаль усіх райцэнтраў.

***— Апошнім часам шмат гавораць і пішуць пра сацыяльнае служэнне праваслаўнай царквы. Якія самыя значныя справы на гэтай ніве робяцца ў вашай епархіі?***

— У Святой Волі Івацэвіцкага раёна служыць айцец Мікалай, вялікі энтузіяст стварэння прытулку для тых, хто па розных прычынах яго не мае. У вёсцы ўзводзіцца дом, дзе змогуць атрымаць дах над галавой, кавалак хлеба і слова спагады тыя, хто мае ў гэтым вострую патрэбу.

**Радуе, што многія людзі пацягнуліся да веры, што адпраўляюць дзяцей у нядзельныя школы. А дзеці-слухачы нашых школ, бывае, потым бацькоў агітуюць прыйсці ў храм і запоўніць прабелы ў рэлігійных ведах.**

А ў Пінску вядзецца вялікая работа па падрыхтоўцы да ўзвядзення цэнтра сацыяльнай дапамогі. Тут запланавана размясціць дзіцячы хоспіс, аддзяленне рэабілітацыі, прытулак для старых. Нельга сказаць, што названыя ўстановы давядзецца пачынаць з нуля. Дапамогай хворым, адзінокім, абяздоленым праваслаўныя святары і вернікі займаліся і да гэтага, толькі ў розных месцах горада, у розных прыходах. Цэнтр жа дазволіць «звесці» добрую справу ў адно месца і пашырыць нашы магчымасці. У агульным цэнтры нават хворыя людзі змогуць адзін аднаго падтрымліваць. Сюды стане магчымым залучаць больш валанцёраў, асабліва з ліку моладзі. Гэтай дзейнасці кіраўнік аддзела сацыяльнага служэння епархіі айцец Сергій надае асаблівае значэнне. Пінск — маладзевы горад, тут працуе ўніверсітэт, ёсць цэлы шэраг сярэдніх навучальных устаноў. Вельмі важна да добрай справы прыцягнуць як мага больш моладзі. Калі хлопцы і дзяўчаты прыйдуць папрацаваць у цэнтр, яны атрымаюць на ўсё жыццё бясцэнныя ўрокі спагады, міласэрнасці, цярпення. Гэта хоць крышачку дапаможа ім у далейшым стаць добрымі бацькамі, свядомымі грамадзянамі сваёй краіны.

Вялікая бяда нашага грамадства ў тым, што занадта шмат бацькоў не займаюцца выхаваннем дзяцей. Дзеці растуць самі па сабе. А бацькі, знаходзячы апраўданне ў сваёй вялікай занятасці, адкупляюцца ад дзяцей дарагімі цацкамі, такімі, як камп'ютар. І што атрымліваецца? Дзіця не развіваецца, не думае, за яго думае машына. Цяпер стала амаль што нормай, калі з камп'ютара спісваюць сачыненні, выконваюць такім чынам іншыя школьныя заданні. Цяперашнія школьнікі табліцу множання на памяць не ведаюць. У сеціве, на жаль, юны чалавек знаходзіць шмат таго, што яму наогул не патрэбна альбо прыносіць шкоду. Калі нешта ідзе не так, бацькі і грамадства пачынаюць шукаць вінаватых, кажуць, што школа вінавата. Я з гэтым не згодзен. Школа сапраўды аслабла апошнім часам. Але глыбінныя прычыны праблем трэба шукаць у саміх сабе, у кожнай сям'і.

***— І як жа можна пераадолець бездухоўнасць, якой, на жаль, як вірусам, заражаецца пэўная частка маладога пакалення?***

— Калі ўважліва чытаць разважанні старцаў, можна знайсці такую думку: мы знаходзімся ў падарожжы. Духоўны сэнс падарожжа вельмі вялікі. Памятаеце, як Майсей вадзіў па пустыні яўрэйскі народ? Якая ж там адлегласць — з Егіпта да Святой зямлі, а яны ішлі доўгія сорак гадоў. Такі прамежак часу быў патрэбен, каб старое пакаленне з яго дрэннымі звычкамі і няправільнымі духоўнымі ўстаноўкамі памерла, і на змену яму прыйшло новае пакаленне, свабоднае ад заган. Так і тут патрэбен час, каб пераадолець пустыню бязбожжа, атэізму, шматлікіх перамен і перабудоў. За пэўны час чалавек мусіць пераасэнсаваць сваё стаўленне да матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў. Вядома, шлях надзвычай цяжкі. Тыя ж старцы гаварылі: «Калі б усе разам сказалі адначасова: «Госпадзі, даруй нам і памілуй!», свет стаў бы лепшым. Здаецца, простая рэч, толькі ажыццявіць яе немагчыма. Да лепшага нельга прыйсці хутка.

***— Відаць, нярэдка да вас звяртаюцца вернікі з пытаннем, як жыць у цяперашнім няпростым свеце, за што трымацца душой? Што вы адказваеце на такія ці падобныя пытанні?***

— Трымацца трэба найперш за веру, бо без веры нікуды не ступіш... А другое, трэба трымацца за добрую сям'ю. Адзін з вельмі шаноўных нашых святароў сказаў мне аднойчы: «У наш час сям'я — найбольшы духоўны подзвіг». Так яно і ёсць. Чалавек, які стаў добрым сямейнікам, заслугоўвае найлепшай пахвалы. Бо ў сям'і можна навучыцца спагадзе і цярпенню, навучыцца клапаціцца пра іншага, пераадолець уласны эгаізм. А на практыцы мы бачым: працэнт разводаў у адносінах да шлюбаў недзе даходзіць да палавіны. Разводзяцца людзі, якія пражылі ў шлюбе не толькі год-два, але і дзесяць, пятнаццаць, дваццаць гадоў. На маім працоўным стале ёсць папка, дзе зафіксавана скасаванне шлюбаў тых людзей, якія вянчаліся ў царкве. Тут захоўваюцца гісторыі, якія ў пэўнай ступені адлюстроўваюць стан грамадства. А ён характарызуецца тым, што людзі несур'ёзна ставяцца да самага галоўнага ў жыцці кожнага — да стварэння сям'і.

Да мяне гады два таму прыходзіла адна пара. Яны не пражылі ў шлюбе ні дня і прыйшлі разводзіцца. Маладыя людзі распісаліся, павянчаліся, а за вясельным сталом дзве сваццconsole не знайшлі агульнай мовы. У выніку канфлікту паміж маці жаніха і нявесты вяселле проста разагналі. Гэтая гісторыя падобна да анекдота, але, на жаль, гэта чыстая праўда...

Раней у беларускай вёсцы, ды і не толькі ў вёсцы, у традыцыі панавала іншае стаўленне да шлюбу. Без бацькоўскага благаславення ніхто пад вянец не ішоў. Цяпер згоды не пытаюць, над рашэннем доўга не думаюць, і вынікі не прымушаюць сябе чакаць.

Значыць, недастаткова пераканаўча мы даводзім маладому пакаленню, што сям'я — гэта малая царква, аснова ўсяго. Будзе моцная сям'я — будзе моцная дзяржава. Так было спакон вякоў на нашай зямлі. Але за апошняе стагоддзе страчана нямала традыцый, якія мелі ўплыў на духоўны стан грамадства. Я кажу пра пашану да сваіх каранёў, самабытнасці, веры бацькоў і дзядоў. Хоць тут, на Палессі, што прыемна, многае засталося, праўда, найбольш у асяродку старэйшага пакалення. Вяскоўцы не забыліся пра звычаі продкаў, не выкінулі народны касцюм. Калі ў Жыровічы на 20 мая з'язджаюцца вернікі, то давыд-гарадоцкіх жанчын можна лёгка адрозніць па адмысловых галаўных уборах. Жыхаркі ганцавіцкіх вёсак вылучаюцца яркімі колерамі сваіх строяў. Прыемна, што і ў хатах многіх палескіх гаспадынь захоўваюцца вышыўкі, абрусы, адзенне з часоў іх бабуль і матуль. Палешукі — людзі разважлівыя, няспешныя ў прыняцці рашэнняў, разам з тым настойлівыя, працавітыя.

***— Такія, якімі апісаў іх Якуб Колас у сваім рамане «На ростанях»?***

— Так, усё апісана праўдзіва, і многае актуальна. Тут жа спрэс коласаўскія мясціны, дзе ён маладым настаўнічаў: і Пінкавічы, і Люсіна. Дарэчы, Канстанцін Міцкевіч вянчаўся са сваёй жонкай Марыяй Дзмітрыеўнай у нашай Свята-Варварынскай царкве. У яго творы напісана, што вянчаліся маладыя настаўнікі ў чыгуначнай царкве. Я нядаўна знайшоў звесткі, што Пінская Варварынская царква была перададзена чыгуначнаму ведамству ў 1906 годзе. Значыць, гаворка ідзе менавіта пра гэтую царкву. Думаю, было б нялішнім з гэтай нагоды змясціць мемарыяльную дошку на будынку храма. Ёсць жа такая дошка на саборы ў Маскве, дзе вянчаўся Пушкін.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

## Даведка «Звязды»

***Архіепіскап Стэфан (Ігар Пятровіч Корзун) нарадзіўся ў 1944 годзе ў вёсцы Корзуны Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. У 1975 годзе скончыў Маскоўскую духоўную семінарыю, а ў 1979 годзе — Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. У 1989-1990 гады — рэктар Мінскай духоўнай семінарыі. З 4 сакавіка 1990 года — епіскап Пінскі і Лунінецкі. 25 лютага 2000 года ўзведзены ў сан архіепіскапа. Узнагароджаны ордэнам прападобнага Сергія Раданежскага III ступені, ордэнам прападобнага Сергія Раданежскага II ступені, ордэнам святога дабравернага Данііла Маскоўскага II ступені.***

Кніжная паліца

# КЛАСІКІ ГАВОРАЦЬ...

**Напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў адной са старэйшых бібліятэк сталіцы — імя Льва Талстога — адбылася прэзентацыя кнігі Таццяны Падаляк «Дыялогі на мяжы стагоддзяў. Класікі і сучаснікі ў інтэр'еры часу», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Вядомыя постаці беларускай літаратуры і культуры на старонках выдання разважаюць пра жыццё, каханне, чалавечыя каштоўнасці... і мову.**



Кніга — вопыт шматгадовай плённай працы аўтаркі. Падчас працы ў газеце «Звязда» на працягу многіх гадоў Таццяна Уладзіміраўна сустракалася з вядомымі людзьмі эпохі, з іх роднымі і нашчадкамі. У выніку найцікавейшыя інтэрв'ю выходзілі на палосах рэспубліканскай газеты, часам ствараючы пэўную сенсацыю. Менавіта з гэтых публікацый некаторыя чытачы ўпершыню даведаліся пра нялёгкае дзяцінства Кузьмы Чорнага, вядомых паклоннікаў актрысы Купалаўскага тэатра Галіны Бальчэўскай, драматычную біяграфію Міхаіла Савіцкага...

На прэзентацыю прыйшло шмат моладзі. Прычым, як ні дзіўна, пераважалі джэнтльмены, якія вучацца ў ліцэі №5 транспартнага будаўніцтва. Калі параўноўваць са школай — вучні старэйшых класаў. Таццяна Падаляк, як таленавіты выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ, улавіла гэтую акалічнасць і павяла гутарку ў межах школьнай праграмы. І ўсё, як кажуць, не без падстаў: у яе кнізе не адно інтэрв'ю прысвечана класікам беларускай літаратуры, чые творы якраз вывучаюць старшакласнікі. Адным словам, атрымалася прэзентацыя-ўрок. Падлеткі мелі ўнікальную магчымасць пазнаёміцца з класікамі не толькі ў якасці аўтараў паэзіі ці прозы, а ўбачылі ў іх звычайных людзей са сваімі марамі, думкамі, перажываннямі.

І невыпадкова кандыдат філалагічных навук, дацэнт пачала з Пімена Панчанкі — чалавека, які не адзін верш прысвяціў роднай мове.

— Так атрымалася, што апошняя сустрэча з журналістамі ў Пімена Панчанкі адбылася са мной, — расказвае Таццяна Уладзіміраўна. — Я была яшчэ зусім маладой. І вось што мяне ўразіла. Пімен Панчанка быў ужо вельмі пажылым чалавекам і вельмі хворым — ногі паэта амаль не слухаліся, але, тым не менш, ён мяне сустракаў стоячы. «Я не магу не выказаць павагу і пашану жанчыне», — такімі былі яго словы.

Як успамінае аўтарка кнігі, Пімен Панчанка з крыўдай успамінаў, як адвярнуліся ад беларускай мовы. У 50-я гады навучанне ў многіх школах, тэхнікумах і ВНУ вялося па-беларуску. Але тут прыехаў у Мінск кіраўнік СССР Мікіта Хрушчоў. А тагачасны кіраўнік нашай краіны Кірыл Мазураў, былы партызан і валявы чалавек, у тэатры оперы і балета чытаў даклад на беларускай мове. Хрушчова гэта вельмі раззлавала, і, па ўспамінах Пімена Емяльянавіча, ён сказаў: «Запомните: кто быстрее перейдёт на русский язык, тот быстрее придёт в коммунизм». І літаральна на наступны дзень у Беларусь прыйшла тэлеграма тагачаснага міністра культуры Кацярыны Фурцавай, у якой гаварылася, што беларускую мову навучання патрэбна скасаваць, перайсці на рускую. Вядома, якім гвалтам гэта рабілася.

Вельмі сябраваў з Піменам Панчанкам Максім Танк. Нельга забыць яго верш «Родная мова», які таксама вывучаецца па школьнай праграме.

— Максім Танк напісаў гэты верш падчас вайны — у 1943 годзе, — скіроўвае ўвагу школьнікаў Таццяна Падаляк. — Ён быў выкліканы з фронту і працаваў у Маскве ў газеце «За Савецкую Беларусь». Душа балела за Беларусь, за родную мову. Як, дарэчы, і да вайны. Яўген Іванавіч Скурко родам быў з Заходняй Беларусі, дзе, як вядома, беларуская мова была пад забаронай. У канцы 1930-х гадоў польскі міністр асветы Скульскі заявіў, што праз 10 гадоў у Польшчы (у яе складзе была Заходняя Беларусь) нават са свечкай не знойдзецца ні аднаго беларуса. І малады Максім Танк, бунтар, прыгажун, яшчэ зусім юнак, напісаў чатыры радкі, за якія яго пасадзілі ў турму на Лукішках, што ў Вільні. Вось яны:

*«Калі няма на свеце маёй мовы,*
*Майго народа і мяне самога,*
*Дык для каго будуеце, панове,*
*Канцлагеры, катоўні і астрогі?»*

— Што яшчэ мяне ўразіла з аповеду сына паэта (у кнізе змешчаны дыялог з сынам Танка Максімам) дык гэта завяшчанне Максіма Танка, — працягвае аўтарка кнігі. — У сваім завяшчанні ён прасіў пахаваць яго на тых могілках, дзе пахаваны яго бацькі (ён з Мядзельскага раёна). Яўген Іванавіч хацеў, каб не ставілі ніякага помніка, а толькі на стэле, якую ён некалі паставіў сваёй маці, напісалі яго імя. Яшчэ Максім Танк прасіў, каб не называлі яго іменем вуліц і ўстаноў, не ставілі помнікаў, не вешалі мемарыяльных дошак, а на пахаванні не неслі ордэнаў. Вось што яшчэ ўразіла сына. Бацькаву труну паставілі ў садзе на табурэтках, была страшэнная гарачыня. Па краях усяго перыметра труны сядзелі зялёныя конікі. Прычым так шчыльна, што адзін аднаго скідвалі. І ў такім незвычайным абрамленні адбывалася развітанне з народным паэтам Беларусі.

Не абышла ўвагай Таццяна Падаляк і Кузьму Чорнага. Яна размаўляла з яго дачкой Рагнедай. Вельмі цяжкім быў лёс у пісьменніка. І ў сённяшніх падручніках не пішацца, што, аказваецца, Кузьма Чорны быў рэпрэсаваны. Праўда, праз 8 месяцаў яго адпусцілі. Самае цікавае, што ён ведаў, хто напісаў на яго данос, але дараваў гэтаму чалавеку. Дачка Кузьмы Чорнага не адкрыла, што гэта быў за пісьменнік. Толькі сказала, што потым гэты чалавек прыходзіў да іх у хату, яны доўга размаўлялі з Кузьмой Чорным. На здзіўленне журналісткі, дачка пісьменніка дадала: бацьку вельмі падабалася з ім размаўляць, што сведчыць аб тым, якім мяккім чалавекам ён быў.

Колькі цікавага з вуснаў аўтаркі давялося пачуць і пра Петруся Броўку. Тым больш, што ліцэісты хутка будуць праходзіць яго паэму «Голас сэрца». «Хочаце ведаць, чаму ён напісаў гэты твор? — заінтрыгавала падлеткаў Таццяна Падаляк. — Яго маці замучылі ў Асвенцыме, яна была спалена ў гэтым страшэнным канцлагеры... Увогуле, ён нарадзіўся ў беднай сям'і, дзе было 10 дзяцей. Пашчасціла гутарыць з сынам Петруся Броўкі Юрыем. І мяне цікавіла, як ён стаў паэтам. Цудоўна ён пра гэта сказаў сам у сваім вершы:

*«Не пытайся пра гэта,*
*Бо адказу не дам.*
*Як зрабіўся паэтам,*
*Я не ведаю сам.*

*Свой радок на паперы*
*Не чакаў я спаткаць.*
*Проста сэрца без меры*
*Захацела спяваць...»*

— Калі ведаеш гэтыя дэталі біяграфіі, зусім інакш глядзіш на тое, што напісаў чалавек, — перакананa Таццяна Падаляк.

Не выклікае сумнення: кніга вартая таго, каб яе прачыталі. Тут можна даведацца і пра адзінае каханне Максіма Танка, і пра гісторыю псеўданіма Кузьмы Чорнага, і пра тое, каму Пятрусь Броўка прысвяціў свой верш «Александрына», каго кахаў Уладзімір Караткевіч, пра асабістую ваенную трагедыю сям'і Івана Чыгрынава, пра жыццёвы шлях паэта-песенніка Аляксандра Лягчылава... Дарэчы, гэта толькі першая частка выдання. Яна пра тых, хто ўжо пайшоў з жыцця. Неўзабаве свет убачыць і другая частка. У ёй будуць не менш знакамітыя асобы, найцікавыя факты з іх біяграфіі, малавядомыя старонкі асабістага жыцця — на гэты раз нашых сучаснікаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара**

# «МЫ ДА АПОШНЯГА ВЕРЫЛІ, ШТО ЮЛЕЧКА ПРАЧНЕЦЦА...»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

«У нас было поўнае разуменне, — кажа Юрый. — Юля была доўгачаканым дзіцем. Мы з Алай рабілі для яе ўсё, што маглі. І яна пра нас клапацілася. На сярэбранае вяселле зрабіла нам сюрпрыз: замовіла рэстаран, тамаду. Калі Вадзім, з якім яны 8 гадоў сябравалі, зрабіў прапанову, Юля пачала рыхтавацца да вяселля. Завяла спецыяльны дзённік, каб нічога не забыцца. Сярод пунктаў былі і такія, як «упрыгожыць пакой для выкупу нявесты», «прыгожа адзецць тату»... Юля была таленавітым дызайнерам. За што б ні бралася, усё хацела давесці да ідэальнага стану... Вельмі даражу прыгожым будаўнічым касцюмам, які Юля правезла мне з Літвы. Казаў ёй, «дачушка, навошта ты трацілася, у мяне ж хапае старых штаноў ды куртак, каб працаваць на лецішчы». А яна толькі ўсміхалася (Юрый нейкі час маўчыць, збіраецца з думкамі). ...Нават пасля таго, як дачкі не стала, я атрымаў ад яе падарунак на свой дзень нараджэння, — на вочы мужчыны наварочваюцца слёзы. — Мастак Юрый Якавенка прынёс карціну. Я яму адразу сказаў, што не магу прыняць такі падарунак, бо ведаў, што карціна вельмі дарагая. «Калі даведаецеся ад каго яна, не адмовіце», — пачуў у адказ. Аказалася, гэту карціну Юля нагледзела яшчэ ў сакавіку, перад аперацыяй. Уяўляеце, у яе аперацыя, а яна думае, які падарунак мне зрабіць у чэрвені...

**— Што было на той карціне?**

— Карціна называецца «Цмок». Я нарадзіўся ў год Цмока.

...Юлі было ўсяго 25. Пасля ўніверсітэта яна паспела папрацаваць у выставачнай зале Гродзенскага гарвыканкама, дызайнерам-афарміцелем у адным з атэляў Гродна.

**Усе як адзін думалі пра сябе, пра тое, як сысці ад пакарання, клапаціліся пра карпаратыўныя інтарэсы... І не далі Юлі апошняга шанцу на жыццё.**

— У нас з Алай свой бізнес, звязаны са стварэннем рэкламы. Усе здзіўляліся, чаму мы Юлю да сябе на працу не бяром. А яна сама не ішла, бо разумела, што мы яе заўсёды прымем. Працавала на іншых людзей, не хацела, каб яе ўспрымалі як «татаву дачку». Юля была таленавітай. Перамагла ў конкурсе плакатаў супраць СНІДу і стала прэзідэнцкім лаўрэатам. За плакат, прысвечаны тэме бежанцаў, атрымала прэмію ЮНЕСКА. Дачка ўваходзіла ў лік «залатой моладзі». Калі прапанавалі паехаць вучыцца ў Італію, Германію, Францыю, Юля, адна з групы, адмовілася. Сказала: «Хачу быць з вамі...»

Паступіла дзяўчына вучыцца на дызайнера ў суседнюю Літву. Практычна кожныя выхадныя прыязджала дадому. Спачатку на цягніку, пасля атрымала еўрапейскія правы.

— Паступала на платную форму навучання, але добра здала сесію, і яе перавялі на бясплатную. Нават стала атрымліваць стыпендыю. За сэканомленыя на вучобе грошы мы набылі ёй машыну.

## «Галоўнае — не пластыка. Ёй было цяжка дыхаць па начах»

Праблемы з носам пачаліся ў Юлі ў дзяцінстве, пасля таго, як у школьным двары ёй трапілі ў твар сняжком.

— Снег быў мокры. З носа пайшла кроў. Мяне адразу выклікалі з працы. Я адвёз дачку ў траўмапункт. Але там сказалі, што ўсё добра, і адправілі дадому. Пазней аказалася, што нос быў зламаны. З часам у Юлі на носе з'явілася гарбінка, каля яе — ямінкі, адна ноздра практычна не дыхала. Урачы казалі, што, калі не зрабіць аперацыю, з узростам нос будзе «правальвацца» яшчэ больш, бо храсткі дрэнна прырaслі.

Юля збіралася замуж 31 жніўня. Ужо і заяву з Вадзімам падалі, і ў рэстаране аванс пакінулі. Таму, каб да вяселля, як кажуць , «загаілася», яна вырашыла зрабіць аперацыю вясной.

Хірурга выбірала сама па інтэрнэце. Водгукі пра Віктара Серабро былі станоўчыя. 35 гадоў стажу. Да таго ж хірург з'яўляецца загадчыкам аддзела пластычнай хірургіі дзяржаўнай бальніцы. У «Экамедсэрвісе» ён працаваў па сумяшчальніцтве на паўстаўкі.

Тады, вядома, ні бацькі, ні яе жаніх, ні сама дзяўчына не маглі і падумаць, чым скончыцца для іх вечар 26 сакавіка...

— Замест дзвюх гадзін аперацыя доўжылася амаль тры. Дзесьці ў 19.40 адчыніліся дзверы аперацыйнай, нашу дачку павезлі ў палату. Яна дыхала вельмі надрыўна і цяжка. Праз нейкі час нам дазволілі ўвайсці ў палату. Там нас з Алай ахапіў жах: Юля не варушылася. Мы сталі надзяваць ёй цёплыя шкарпэткі — ведалі, што пасля аперацыі вельмі мерзнуць ногі. Я занепакоіўся, бо ведаю, як гэта выходзіць з наркозу: сам перанёс 7 аперацый. Але ўсе вакол пераконвалі, што ўсё ідзе па плане. Анестэзіёлаг сказаў, што, калі мы Юлю пабудзім, яна ўсю ноч будзе мучыцца ад болю. Чым і прытупіў нашу пільнасць. Вядома, хто ж хоча нанесці боль свайму дзіцяці...

У той дзень бацькам ніхто не сказаў, што падчас аперацыі адбылася пазаштатная сітуацыя.

Бліжэй да 23.00 ахова папрасіла пакінуць палату... Кожныя паўгадзіны, ужо з дому, Юрый з Алай тэлефанавалі, каб высветліць, ці прыйшла ў прытомнасць дачка. Каля дзвюх гадзін ночы ім патэлефанаваў хірург Серабро і сказаў, што Юля ў рэанімацыі...

**— Што апошняе сказала Юля, памятаеце?**

— «Мама, не сварыся на тату». ...Так атрымалася, што ў той злашчасны дзень я праскочыў паварот на «Экамедсэрвіс». Усё ж такі Мінск не такі знаёмы горад, як Гродна. У нас быў запіс на вызначаны час, таму Ала пачала нервавацца, нават прыкрыкнула на мяне...

...23 красавіка Юрый з Алай пачалі бегаць па Мінску ў пошуках вясельнай сукенкі — але ўжо для іншай мэты...

— Калі супрацоўнікі салона даведаліся, чаму з намі няма нявесты, яны расплакаліся, — узгадвае Юрый. — Няма нічога страшней за смерць уласнага дзіцяці, асабліва калі яно памірае ў пакутах.

...Пасля пахавання дачкі Ала Кубарава сама трапіла ў рэанімацыю з сардэчным прыступам. І дагэтуль, прызнаўся Юрый, яна «сядзіць» на антыдэпрэсантах, якія прапісалі ўрачы.

— Мы з жонкай знаходзімся ў дэпрэсіі, нас мучыць бяссонніца. Першы час на пару гадзін выходзілі на працу, цяпер — на цэлы дзень. Ведаеце, сядзець без справы вельмі цяжка. Добра, што ў нас ёсць за 4 кіламетры ад Гродна лецішча: уцякаем туды ад сумных думак. У прыватным доме заўсёды занятак можна знайсці: нешта прыбіць, падфарбаваць. Трэба хоць нейкай механічнай працай займацца. Ведаеце, калі здарылася бяда, першае жаданне было наогул кінуць усё і з'ехаць з краіны куды вочы глядзяць, каб цябе ніхто не ведаў. Але ад сябе не ўцячэш...

**«Наша трагедыя павінна стаць сігналам нядбайным урачам. Яны павінны альбо самі звольніцца, альбо іх павінна звольніць кіраўніцтва».**

**— Юрый, а праўда, што вы хочаце ўсынавіць дзіця?**

— Мы думалі пра гэта даўно, яшчэ калі Юля была жывая. Цяпер, каб нейкім чынам зачапіцца за гэтае жыццё, знайсці ў ім сэнс, вырашылі ажыццявіць даўняе жаданне. Спадзяёмся, што ў нас усё атрымаецца. Праўда, па нашых законах трэба, каб пасля смерці Юлі прайшоў год. І, думаю, гэта правільна. Бо ўсынаўленне — сур'ёзны крок. Гэта павінна быць свядомае рашэнне, а не выклікання адчаем.

## «Лепш бы я тых грошай не зарабіў...»

**— На форумах людзі рознае пішуць, асабліва пасля таго, як даведаліся, што «Экамедсэрвіс» павінен выплаціць вам больш як мільярд рублёў у якасці кампенсацыі матэрыяльнай і маральнай шкоды...**

— Калі нехта думае, што мы падалі іск, бо хочам нажыцца на смерці дачкі, гэта іх права. Я нікому нічога даказваць не збіраюся. Мы забяспечаны: і кватэра ёсць, і дом. Зразумела, грошы нам Юлю не заменяць. Гэта сімвалічнае пакаранне. Бо, заўважце, «Экамедсэрвіс» наогул ніяк не праходзіў па крымінальнай справе... Падчас аперацыі адключыўся апарат штучнага дыхання: аказалася, ніхто не цікавіўся яго спраўнасцю ажно тры гады! Галоўны інжынер медцэнтра сказаў на судзе, што калі б Міністэрства аховы здароўя патрабавала, ён адрамантаваў бы апарат... Ён не сказаў: «Адрамантаваў бы, калі б ведаў, што гэта пагражае жыццю пацыентаў...» Гэта так мяне абурыла!.. Як і тое, што анестэзіёлаг не дачакаўся, пакуль Юля прыйдзе ў прытомнасць пасля аперацыі, і паехаў у Маскву на чарговую аперацыю. Людзі толькі аб прыбытку думаюць, таму з нашага боку гэта толькі спосаб прымусіць кіраўніцтва задумацца, каго яны наймаюць. У маёй галаве не ўкладваецца: як можна было ўзяць для абслугоўвання медыцынскага абсталявання чалавека з сельгасадукацыяй (маецца на ўвазе Вадзім Ліхута. — **Аўт**.)?..

**— Я так разумею, вы не задаволены рашэннем суда? (Нагадаю, 31 студзеня суд прагаварыў анестэзіёлага Аляксандра Шурава і галоўнага інжынера Вадзіма Ліхуту, адпаведна, да 4 і 3 гадоў калоніі-пасялення, гендырэктара Галіну Валжанкіну — да 2 гадоў умоўнага абмежавання волі. — Аўт.)**

— Я разумею, што ніякае пакаранне нам Юлю не верне. Нават калі б ім смяротнае пакаранне вынеслі. Тым не менш, на мой погляд, імёны ўсіх вінаватых у смерці нашай дачкі павінны быць агучаны. Інакш атрымліваецца, суд не меў ніякага сэнсу, і медыкі будуць думаць, што заўсёды можна «адмазацца». Мы пайшлі на гэты душэўны боль, каб такое больш ніколі не паўтарылася, каб дапамагчы іншым людзям, якія будуць звяртацца да ўрачоў. Чаму не назвалі хірурга? Я не разумею, як такое можа быць, што галоўны інжынер вінаваты, а хірург, які рабіў аперацыю, — не? Калі на судзе кажуць, што яго нельга пазбаўляць ліцэнзіі, што ён можа яшчэ выратаваць шмат людзей, то я гэтага не разумею. Разумею, калі б гэта быў адзін урач на ўсю краіну, які робіць найскладанейшыя аперацыі на сэрцы. А Віктар Серабро — пластычны хірург.

Я лічу, што вінаватая ўся аперацыйная брыгада. Менавіта іх безадказнасць прывяла да смерці нашай дачкі. Вядома, ёсць віна і кіраўніцтва «Экамедсэрвіса», якое сэканоміла на абсталяванні. Але тут гаворка ідзе пра антычалавечнасць, урачы забыліся на клятву Гіпакрата. Я разумею, што ўсякае магло здарыцца, але пакінуць пацыента ў такой сітуацыі і не паспрабаваць яго выратаваць — гэта злачынства... Гэта тое ж самае, як збіць чалавека і пакінуць яго на дарозе, не аказаўшы дапамогу. Быў бы сярод іх хоць бы адзін сумленны чалавек, выклікаў бы «хуткую»... А выйсці з аперацыйнай — і тут жа збегчы? Усе як адзін думалі пра сябе, пра тое, як сысці ад пакарання, клапаціліся пра карпаратыўныя інтарэсы... І не далі Юлі апошняга шанцу на жыццё.

За аперацыю Кубаравы заплацілі 15 мільёнаў. Думалі, паколькі кошт высокі, вынік павінен быць найлепшым.

— Лепш бы я гэтых грошай не зарабіў, — уздыхае Юрый. — Я даверыўся рэкламе, лічыў, што там добрыя спецыялісты. Аказалася ж, што бардак — гэта яшчэ мяккае слова, якое характарызуе сітуацыю ў гэтым медыцынскім цэнтры... І гэты бардак выліўся на нас. Атрымліваецца, гэта ў іх норма — узяць грошы, але не правяраць апаратуру, якая забяспечвае жыццёва важную функцыю дыхання, кінуць чалавека, не пераканаўшыся, што той прыйшоў у свядомасць. Наша трагедыя павінна стаць сігналам нядбайным урачам. Яны павінны альбо самі звольніцца, альбо іх павінна звольніць кіраўніцтва.

*Балючая гісторыя дагэтуль не ўкладаецца ў маёй галаве. Няўжо трэба было прынесці ў ахвяру Юлю, маладую і прыгожую, каб усе зразумелі, што кожны чалавек на сваім месцы павінен добрасумленна выконваць свае абавязкі?*

*...А ўсё пачалося з таго злашчаснага сняжку. Дактары ў той час, пэўна, таксама спяшаліся дадому і замест таго, каб проста падправіць дзіцяці носік, кінулі жартаўліва: «Да вяселля зажыве». Праз шмат гадоў урачэбная халатнасць паўтарылася...*

*Застаецца дадаць, што кропка ў гэтай справе яшчэ не пастаўлена. Як гэта ні дзіўна, касацыйныя скаргі на рашэнне суда першай інстанцыі падалі ўсе тры абвінавачаныя...*

**Надзея ДРЫЛА.**